***Аляксей Крывёнак***

# ЭЛЕМЕНТЫ ТРАДЫЦЫЙНАЙ АБРАДНАСЦІ БЕЛАРУСАЎ У СУЧАСНЫМ ВЯСЕЛЛІ

Жыццё чалавека ідзе па своеасабліваму «сцэнарыю», у якім фабулу складаюць тры асноўныя моманты: *нараджэнне*, пасля якога дзіця развіваецца ў дарослага чалавека; *вяселле* – працяг роду; і *пахаванне* – завяршэнне зямнога існавання чалавека. Свята *вяселле*, у прамым і пераносным сэнсе, займае цэнтральнае месца ў чалавечым жыцці, паколькі яно деліць яго на дзве часткі – да і пасля шлюбу. І такі падзел дае магчымасць ўспрымаць цэнтральных герояў свята (маладых) як асобаў, якія знаходзяцца на мяжы існавання ў грамадстве ў новай якасці – ў якасці людзей дарослых і самастойных.

У традыцыйнай культуры беларусаў – цэнтральныя ўдзельнікі вяселля – гэта маладая пара, дасягнуўшая ўзроста палавога саспявання. Іх жаданне стварыць асобную сям'ю з'яўляецца вялікай падзеяй для родных і моладзі, якія маюць крэўныя, сваяцкія і сяброўскія дачыненні да маладых. Усё гэта стварала цэлы шэраг рытуальных дзей, якія відавочна перадавалі традыцыйную сутнасць вяселля. Такімі момантамі старажытнага вяселля, з'яўляюцца:

- выкуп дружынай жаніха нявесты ў яе бацькоў, якая часта прадавалася як сапраўдны тавар, што надавала драматычнасць моманту, і што можна прасачыць у песнях (*«Зялён рамон па падвор'яйку сьцеліцца, /Млада Гануська з сваёй мамачкай дзеліцца: /- Табе, мамачка, адна кашулька, а мне дзьве, /Бо я пайду ў чужыя людзі, а ты не. Астаяцца, мая рутанька, ў гародзі, /Ні палівай, мая маманька, вадою, А палівай яе горкаю сьлізою»)* [1, с. 384];

- узаконьванне адносін праз абрад вянчання у храме, у дахрысціянскім варыянце саджэннее на «пасаг» (казліная скура з якой быў пашыты кажух) і публічнае прызнанне бацькамі і абшчынай іх шлюбу;
- адорванне і віншаванне маладых – дапамога абшчыны ў стварэнні сваёй уласнай гаспадаркі («*...Дару цябе палаценцам, каб не плакала, седзячы пад акенцам. /- Дару шпулечкай ніцей, каб табе жылося добранька сярод чужых людзей. /- Дару цябе бойкаю (у якой збіваюць масла. – Т. В.), каб не было перадойкаю. / - Дару цябе золата бочку, каб нарадзіла сем сыноў і адну дочку. /-Дару рубель на калыбель...*»*)* [1, с. 382];

- перыяд вясельнага гуляння і ўшанавання маладых, якім кіраваў гаваркі і аўтарытэтны чалавек (рэй), або некалькі людзей, якіх прызначалі галоўнымі сватамі;

- першая шлюбная ноч, пасля якой дзяўчына набывала статус жанчыны. Былі і іншыя, больш дробныя па сваёй значнасці рытуальныя дзеі, якія мелі больш сціплае сімвалічнае значэнне. Як сведчыць сацыяльная практыка XXI стагоддзя, з цягам часу, страціўшы сваю магічную і практычную сутнасць, структурныя складовыя традыцыйнага вяселля не зніклі ўвогуле, а, трансфармаваўшыся, прадстаюць па-новаму і, на жаль, не заўсёды ў дакладным варыянце. Напрыклад, аб ужыванні караваю ў традыцыйным вяселлі сучасныя даследчыкі пішуць так. «*...Выкарыстанне хлеба ў розных яго выявах: збожжа, бліны, куцця, каравай — мела велізарнае агульнакультурнае значэнне. Ён сімвалізаваў сабой заканчэнне аднаго і пачатак іншага этапу ў жыцці чалавека. Выпечаны хлеб падкрэсліваў закончанасць (смерць) адной фазы, а збожжа (тое, што працягвае жыццё, дае яму новы імпульс) канстатавала пачатак (нараджэнне) іншай. На вяселлі каравай сведчыў пра заканчэнне юнацкасці жаніха і нявесты. Каравай выпякаўся толькі адзін раз — пры першым шлюбе. Калі мужчына ці жанчына стваралі другую сям'ю, рытуальны хлеб не выпякалі, а значыць, і не дзялілі паміж членамі роду... Рытуальны хлеб выпякалі 5-7 жанчын-каравайніц, галоўнай сярод якіх была хросная маці жаніха ці нявесты. Ніколі не запрашалі ўдзельнічаць у гэтым рытуале ўдоў, разведзеных ці бяздзетных жанчын* » [1, с. 278].

Змены, якія мы назіраем у сучасным вяселлі, часам непакоюць: каравай (традыцыйны хлеб з пшаніцы) замяняецца на салодкі торт, які выпякаецца невядома дзе і невядома кім. Але гэта не самае небяспечнае: не жадаючы верыць у магічнасць дзеі ў свяце, арганізатары сучаснага вяселля, фактычна, вульгарна адасобілі момант адорвання маладых з дзяленнем каравая (сімвал перахода маладых у новы статус) ад агульнага рэчышча свята. Каравайны абрад замянілі на дэсерт (торт), які выносяць у канцы вяселля. У лепшым выпадку, ён з'ядаецца пасля вялікай колькасці выпітага алкаголя; у горшым – будзе стаяць на стале, нікому не патрэбны, ці ўвогуле – валяцца на падлозе.

Але многія рытуальныя моманты традыцыйнага вяселля сустракаюцца ў сучасным свяце і не заўсёды выкарыстаны няўдала. Выкуп нявесты, хоць і набыў фармальную, гумарыстычную форму, але не знік ўвогуле. Праз выпрабаванні, якія ладзіць гурт сяброўак кіруемы шаферкай маладой, дзяўчаты даведваюцца як моцна жаніх кахае нявесту і ці не дарма яны яе аддаюць менавіта яму. Пры гэтым, «граючы» на пачуццях жаніха, не пакідаюць магчымасць зарабіць на гэтым грошай і патрабаваць прысмакі (Шаферка: «*За нявесту-Любачку / - Шампанскага бутэлечку. / За прыгажуню-жоначку / - Шакалад «Алёнку». /За сукенку белую - Бутэлечку віннa цэлую. / Каб быў з ёй заўсёды ў пары, Даставай амерыканскія даляры»)*. Жаніх і яго сябры пасля гэтых слоў плацяць выкуп, госці могуць у жарт выкрыкваць: «*Мала плаціш, відаць, не жадаеш быць з ёй заўсёды ў пары*», «*Не скупісь, больш давай!* ».

У савецкі час узаконьванне адносін перайшло на ўзровень грамадскі і замацоўваецца юрыдычна, але ў гэтым ёсць і адмоўныя бакі. Шлюб пазбаўлены ўхвалення, або асуджэння грамадскасці, што нарадзіла такое паняцце як грамадзянскі ці фіктыўны шлюб. У выніку – супольнасць не заўсёды можа ведаць, што пара ў шлюбе, паколькі не абавязкова абвяшчаць публічна аб адносінах. Форма віншавання і адорвання маладых змянілась значна, таксама памяняліся падарункі (дары) з натуральных (карова, конь, зерне,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тканіна і т.д.) – на грашовыя адінкі, за якія ўсё гэта можна купіть. Таксама скараціўся да мінімуму час правядзення самога вяселля. Раней яно магло дасягаць двух тыдняў (тыдзень у хаце нявесты, тыдзень у хаце жаніха), зараз жа, у лепшым выпадку, – два дні, а то і шэсць, сем гадзін. Абавязкі ж галоўных сватоў перайшлі да прафесійных вядучых.

Разгледзіўшы структуру сучаснага вяселля, можна сцвярджаць, што фармальна многае з каранёвай традыцыі страчана, але кардынальна, прынцыпова мала што змянілася. Вяселле толькі дапоўнілася нейкімі новымі нязначнымі па сутнасці дзеямі забаўляльнага характару, якія прыйшлі на змену старым. Вялікая роля моладзі ў вяселлі (носьбітаў прагрэсіўных і крэатыўных поглядаў на жыццё) заўсёды аднаўляла яго, не губляючы асноўнай мэты абраду – стварэння магчымасці назваць гэту падзею самым чуллівым да свайго часу і адным з самых старажытных па сутнасці рытуалам.

**Спіс літаратуры:**

1. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т.3. Гродзенскае Панямонне. У 2 кн. Кн. 1/ В.І. Басько [і інш.] ; аўт. Ідэі Т.Б. Варфаламеева; агул. рэд. Т.Б.Варфаламеевай. – Мінск : Выш. шк., 2006. – С. 384.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ